PolotskSU



**УДК 903.57(476.5) «12/13»**

# ПАХАВАЛЬНЫ АБРАД НЕКРОПАЛЕЙ ПОЛАЦКІХ КУЛЬТАВЫХ БУДЫНКАЎ XII – XIII СТАГОДДЗЯЎ

***А.В. ВАЙЦЯХОВІЧ***
***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск)***

*Разглядаюцца хрысціянскія пахавальныя традыцыі, звязаныя непасрэдна з будаўніцтвам у Полацку спачатку драўляных, а затым і мураваных храмаў. Вакол іх, як і ў суседніх княствах, пачынаюць фарміравацца могілкі, не выключаны пахаванні і ўнутры будынкаў. Гэты працэс супадае з асноўнай тэндэнцыяй фарміравання хрысціянскіх гарадскіх некропаляў ва ўсходнеславянскіх землях – пахавальных комплексаў, зробленых падчас функцыянавання храмаў. Ускосныя сведчанні аб іх наяўнасці выяўлены ў пяці полацкіх мураваных культавых збудаваннях. У Полацку ў якасці княскіх пахавален маглі выступаць Пятніцкая царква Барысаглебскага манастыра, царква на Ніжнім замку, прыбудовы да Сафіі і магчыма крыпта ў храме-пахавальні Ефрасіннеўскага манастыра, які служыў для пахавання кліра. Да XII стагоддзя ўсталяваўся кананічны пахавальны абрад, згодна з якім заможных нябожчыкаў і вышэйшы клір хавалі ўнутры культавых збудаванняў, больш простых – на звычайных могілках. Ён уключаў абмыванне цела памерлага, апрананне яго ў адзенне адпаведна сацыяльнаму статусу нябожчыка, транспартыроўку яго ў храм для адпявання і затым пахаванне непасрэдна ў храме альбо побач з яго сценамі. Найбольш пашыранай формай пахавальнага аб’ёму XII – XIII стагоддзяў у мураваных храмах Полацка з’яўляюцца цагляныя саркафагі, якія размяшчаліся пад падлогай храма. Вонкавая паверхня мураваных саркафагаў тынкавалася і аздаблялася роспісам. Паўзакрытыя аркасольныя нішы аздабляліся мазаікай са смальты. Акрамя цагляных саркафагаў выкарыстоўваліся аб’ёмы, зробленыя з шыферных пліт. Але галоўнай адметнасцю пахавальных комплексаў XII – XIII стагоддзяў у мураваных культавых будынках з’яўляецца наяўнасць падземных крыпт.*

**Уводзіны.** Пашырэнне хрысціянства, якое прыйшло на землі Полацкага княства ў другой палове X стагоддзя [28, с. 35], абумовіла ўзнікненне зусім новага тыпу пахавальнага комплексу, звязанага з культавым будынкам і прылеглай да яго тэрыторыі – царкоўным дваром. Пахавальны абрад, паводле якога рабіліся падобныя комплексы, фарміраваўся пад візантыйскім уплывам і амаль цалкам адпавядаў хрысціянскім некралагічным канонам. У артыкуле разглядаюцца хрысціянскія пахавальныя традыцыі, звязаныя непасрэдна з будаўніцтвам у Полацку спачатку драўляных, а затым і мураваных храмаў.

**Асноўная частка.** Традыцыя хаваць у межах культавых збудаванняў узнікла на хрысціянскім усходзе ў IV – V стагоддзях [5, с. 60] і была звязана з надзеяй на тое, што ў час страшнага суда, у момант уваскрашэння, святы, ў гонар якога пабудаваны храм, замовіць слова за пахаванага. Таму такое месца лічылася вельмі каштоўным і прызначалася для пахавання святароў і заможных асоб.

Візантыйская царква, а потым і ўсходнеславянская кіраваліся паводле Номаканона (у перакладзе Кормчая кніга) – зборніка правоў, які ўтрымліваў царкоўныя каноны і імператарскія канстытуцыі. У артыкуле 173 Номаканона гаворыцца: «У храмах забаронена хаваць памерлых, акрамя святароў, альбо з дазволу архірэяў, стваральнікаў храмаў і іншых асоб, якія маюць асабістыя заслугі перад царквою» [21, с. 356].

Першыя пахаванні, якія мелі дачыненне да хрысціянскіх храмаў, верагодна размяшчаліся каля драўляных цэркваў, якія рубіліся хрысціянскімі абшчынамі. У Кіеве, напрыклад, масавае будаўніцтва драўляных храмаў пачалося, як сведчыць Аповесць мінулых часоў, пасля афіцыйнага хрышчэння кіяўлян Уладзімірам Святаслававічам, які «павеле рубіці цэркви».

Найбольш старажытным цэнтрам хрысціянізацыі Полацкай зямлі, на думку О.М. Рапава, з’яўляецца Ізяслаўль [25, с. 113], дзе ў канцы X – пачатку XI стагоддзя быццам бы існаваў манастыр, у якім пахавалі полацкую княжну Рагнеду – Анастасію. Але ніякіх слядоў манастыра, і тым больш магілы Рагнеды, не знойдзена, а запіс ў Цвярскім летапісе Ю.А. Заяц лічыць недакладным [12, с. 113].

Хутчэй за ўсё першыя цэрквы ўзніклі ў Полацку. Так, П.А. Рапапорт мяркуе, што на месцы мураванай царквы на Ніжнім замку, якая была пабудавана ў першай палове XII стагоддзя, першапачаткова стаяў драўляны храм на каменных падмурках. Храм потым згарэў, аб чым сведчаць праслойка гарэлага дрэва і абпаленых камянёў, якія ляжалі на ўзроўні падмуркаў цаглянага храма. Каля царквы былі выяўлены пахаванні ў драўляных трунах, некалькі з іх былі перакрыты слоем падсыпкі часоў будаўніцтва мураванага збудавання, што дало даследчыку падставу аднесці пачатак фарміравання могілак да часоў існавання драўлянай царквы [26, с. 154].

Пахавальныя комплексы, звязаныя з драўлянымі храмамі, вядомы ў Мсціслаўлі [1, с. 127] і ў іншых усходнеславянскіх гарадах [15, с. 311].

PolotskSU



З усталяваннем хрысціянства як дзяржаўнай рэлігіі ў Полацкай зямлі пачалося будаўніцтва мураваных храмаў. У XII – XIII стагоддзях у Полацку і яго наваколлі існавала тры манастыры: Іаана Прадцечы на Востраве, Бельчыцкі і Спаса-Праабражэнскі (Ефрасіннеўскі), а на тэрыторыі самаго горада – не менш чатырох цэркваў [29, с. 75].

Мураваная Благавешчанская царква была пабудавана ў Віцебску, будаўніцтва замкавай царквы пачалося ў Менску ў канцы XI стагоддзя. Аднак пахавальныя комплексы, зробленыя падчас функцыянавання храмаў, альбо ўскосныя сведчанні аб іх наяўнасці выяўлены толькі ў пяці полацкіх культавых збудаваннях.

Вакол Полацкага Сафійскага сабора, пабудаванага ў сярэдзіне XI стагоддзя, падчас археалагічных даследаваняў ў 1975 – 1980 гадах Вал.А. Булкіным выяўлены складаны комплекс цагляных прыбудоў. У 1977 годзе знойдзены рэшткі, як меркавалася, лесвічнай вежы, амаль квадратнай у плане. Аднак унутры будынка знойдзена пахаванне ў цагляным саркафагу, што можа сведчыць аб іншым прызначэнні прыбудовы [7, с. 114]. У 1978 годзе з паўднёва-ўсходняга боку Сафіі былі раскапаны пяць складзеных з плінфы саркафагаў, якія прымыкалі да паўднёвага прысценку ўсходняга фасада; іх сярэдні памер 2 × 1 м, вышыня каля 0,8 м. Сценкі і падлога саркафагаў былі абмазаны вапнай з дабаўленнем цаглянай крошкі і мелі ружовы колер. Пахавальныя аб'ёмы, арыентаваныя з захаду на ўсход, размяшчаліся пад падлогай прыбудовы. Толькі ў адным з іх утрымлівалася моцна пашкоджанае пахаванне [33, с. 5 – 6]. Канчаткова з усходняга боку сабора былі выяўлены руіны мураванага будынка памерам 30 × 10 м, які прымыкаў да ўсходняга фасада і ахопліваў старажытныя апсіды сабора. У паўднёвай палове паміж трыма слупамі захаваліся фрагменты шматлікіх саркафагаў, складзеных з плінфы. Прыбудова датуецца XII – XIII стагоддзямі [6, с. 358].

Такім чынам, пасля заканчэння асноўнага аб'ёму храма да яго заходняга фасаду была прыбудавана галерэя. Пазней, верагодна, у першай палове XII стагоддзя, з'явілася яшчэ некалькі прыбудоў да асноўнага аб'ёму: прытвор перад паўднёвым уваходам у храм, хрышчальня-пахавальня каля паўднёва-заходняга кута і галерэя ўздоўж усяго ўсходняга фасада, паўднёвая частка якой трактуецца як княская пахавальня [8, с. 263].

Выкарыстанне ўнутранага прыдзела, асабліва ганаровага месца, так званай хрышчальні, у якасці пахавальні абумоўлена глыбокім сімвалічным паралелізмам паміж смерццю і ўваскрашэннем, хрышчэннем і несмяротнасцю. У храмах гэтыя памяшканні маглі выконваць абедзве функцыі адначасова [31, с. 35]. А размяшчэнне саркафагаў у паўднёвай частцы ўсходняй галерэі адпавядае ўсходнеславянскай хрысціянскай традыцыі аддаваць перавагу паўднёваму боку храма для пахаванняў [23, с. 5].

У Бельчыцкім Барысаглебскім манастыры, заснаваным на месцы былой рэзідэнцыі полацкіх князёў у XII стагоддзі, былі пабудаваны чатыры мураваныя храмы: Вялікі сабор, Пятніцкая і Барысаглебская цэрквы і храм-трыконх. Пахавальныя комплексы, верагодна, існавалі ў двух храмах манастыра.

Развaліны Пятніцкай царквы (невялікага аднанефнага бесслуповага храма) у 1926 – 1928 гадах даследаваў І.М. Хозераў. Храм меў падземную камеру-крыпту пад усім будынкам, апрача алтарнай часткі [30, с. 77]. На месцы храма-трыконха не знойдзена відавочных слядоў пахаванняў. Аднак М.М. Воранін узгадве тэкст запіскі XVIII стагоддзя, дзе гаворыцца што каля 1790 года да Полацкай старажытнай Барыса-Глебскай царквы прыбудоўвалася новая рызніца. З пагорка, які знаходзіўся на двары манастыра, было загадана браць пясок. Рабочыя, заглыбіўшыся ў пагорак, выявілі каменную сцяну, а затым і падмуркі храма. На прастольным месцы была знойдзена вялікая яма, дно якой ледзь даставалі доўгім шастом, аднак спусціцца ў яму ніхто не здолеў. Пазней яму засыпалі, не даследаваўшы. На падставе гэтага М.М. Воронін задаецца пытаннем: «напэўна малая Пятніцкая царква мела падземную крыпту ў асноўным памяшканні. Ці не магла і тут быць крыпта, як у храмах раманскага захаду?» [9, с. 102 – 103].

У Спаса-Прэабражэнскім (Ефрасіннеўскім) манастыры, які быў заснаваны ў XII стагоддзі Ефрасінняй Полацкай, існавалі два мураваныя храмы: царква Спаса, дзе не хавалі, і храм-пахавальня.

Раскопкі храма-пахавальні (чатырохстоўпнага, трохнефнага храма, з трох бакоў да якога прымыкалі галерэі) у 1957 – 1964 гадах праводзіў М.К. Каргер [16, с. 240 – 247]. Ва ўсіх галерэях пад падлогай былі выяўлены саркафагі, складзеныя з плінфы на цамяначнай рошчыне, яны размешчаны радамі і арыентаваны з захада на ўсход (мал. 1). У паўднёвай галерэі было знойдзена 7 саркафагаў, у заходняй – 20, у паўночнай – 9. Сярэдні памер саркафагаў 2 × 1 м. Акрамя саркафагаў у паўночнай галерэі знойдзена, на думку Каргера, крыпта для ганаровых пахаванняў памерам 5,2 × 2,5 м, глыбінёй 1,7 м. На падлозе і вакол памяшкання была знойдзена ў вялікай колькасці смальта ад мазаік жоўтага, зялёнага і карычневага колераў, якой была аздоблена падлога крыпты. Мазаікай з дробнай смальты былі дэкараваны часткі сцен храма над саркафагамі ў аркасоліях (нішах для пахавання). Фрагмент падобнай мазаікі быў знойдзены каля аркасолія ў паўднёва-заходнім куце храма. Аркасоліі, напэўна, размяшчаліся ўздоўж паўночнай і паўднёвай сцен царквы, аб чым сведчаць невялікія выступы праз кожныя два метры, якія маглі служыць асновай для іх. Яшчэ тры саркафагі захаваліся ў паўночна-заходнім куце храма.

PolotskSU



Некранутыя пахаванні былі знойдзены ў саркафагах заходняй галерэі. Шкілеты ў асноўным належалі старым мужчынам, аднак сустракаліся, верагодна больш познія, жаночыя пахаванні. Ніякага інвентару і слядоў адзення не выяўлена. На фотаздымках з альбома да справаздачы М.К. Каргера [34] бачны некалькі шкілетаў (мал. 2 – 4). Усе яны ляжаць у саркафагах у выцягнутым стане на спіне, галавой на захад. У адным саркафагу пад голаву нябожчыка пакладзена плінфа, левая рука ляжыць на жываце, правая – на правай ключыцы. У другім – ногі ссунуты стапамі адна да другой, рукі выцягнуты ўздоўж тулава, пад галаву пакладзены камень. У трэццім саркафагу левая рука нябожчыка размешчана на поясе, правая – на грудзях. У чацвёртым – ногі пахаванага прыціснуты адна да другой у галёнках, правая рука на тазавай костцы, левая ссунута ў бок. Пяты саркафаг утрымлівае двайное пахаванне. Адзін шкілет размешчаны ля паўднёвай сценкі саркафага, рукі яго, відаць, былі перакрыжаваны на поясе. Другі шкілет пакладзены побач такім чынам, што правы яго бок ляжыць на першым нябожчыку. Рукі ссунуты ў паўднёвы бок і перакрыжаваны на мяжы двух пахаванняў па лініі жывата першага шкілета. На фатаздымках у артыкуле М.К. Каргера [16, с. 243] бачны яшчэ два саркафагі. У адным пад галаву нябожчыка пакладзена плінфа, рукі перакрыжаваны на поясе. У другім рукі пахаванага перакрыжаваны на поясе. Побач з чэрапам ляжыць яшчэ адзін чэрап. Магчыма, гэта парнае пахаванне.

Усе саркафагі былі перакрыты падлогай з паліванай пліткі жоўтага, зялёнага і карычневага колеру. У паўночнай галерэі, акрамя гэтага, пліткі былі пакрыты чорнай з бляскам палівай.



Мал. 1. Цагляныя саркафагі ў храме-пахавальне



Мал. 2. Пахаванні ў цагляных саркафагах (храм-пахавальня)

PolotskSU





Мал. 3. Пахаванні ў цагляных саркафагах (храм-пахавальня)



Мал. 4. Пахаванні ў цагляных саркафагах (храм-пахавальня)

Ва ўрыўку з жыція Ефрасінні Полацкай ёсць сведчанне аб існаванні ў Полацку храма-пахавальні: «...ёсць цэркаўка святога Спаса ў Сяльцы, дзе Брація наша ляжыць – епіскапы, што былі да нас» [17, с. 47]. Гэта дазваляе, на думку М.К. Каргера, лічыць знойдзены храм старажытнай царквою Спаса, якая служыла першапачатковай усыпальніцай полацкіх епіскапаў у пачатку XII стагоддзя [16, с. 240]. Таксама лічыў і П.А. Рапапорт, які датаваў храм першай паловай XII стагоддзя [26, с. 150].



Мал. 5. Фрагменты шыфернага саркафага з царквы на Ніжнім замку

На тэрыторыі Ніжняга замка ў Полацку пад час раскопак 1976 – 1977 гадоў П.А. Рапапортам былі знойдзены рэшткі мураванай чатырохстоўпнай царквы [26, с. 142 – 161]. З паўночнага боку ён раскапаў невялікія фрагменты падмуркаў галерэй. Агульная схема царквы нагадвала план храма-пахавальні Ефрасіннеўскага манастыра. Падчас даследаванняў у заходняй частцы царквы была знойдзена вялікая колькасць кавалкаў вапняковай абмазкі з загладжанай і часта пафарбаванай паверхняй (карычневы, жоўты і чырвоны колеры). Кавалкі абмазкі да 20 см таўшчынёй. На іх тыльным баку часта бачны адбіткі плінфы. Знойдзены кавалкі абмазкі ад кутоў, і нават ад трохграннага кута. П.А. Рапапорт лічыць, што гэта абмазка ад цагляных саркафагаў, якія абмазваліся вапнай і пакрываліся роспісам. У другім, заходнім, чляненні паўночнага нефа знойдзены кавалкі чырвонага шыферу, у тым ліку два абломкі пліты таўшчынёй 6 см са слядамі дэкаратыўнай разьбы на вонкавай паверхні (мал. 5). Тыльны бок роўна абчасаны і не загладжаны. Гэта рэшткі шыфернага саркафага.

Мужчынскія і жаночыя пахаванні былі выяўлены з вонкавага боку падмуркаў галерэі. Захаваліся сляды драўляных трунаў, якія добра адпавядаюць напрамкам муровак. На думку П.А. Рапапорта, царква ў Ніжнім замку была княскай пахавальняй, пабудаванай у першай палове XII стагоддзя [26, с. 152].

Л.В. Аляксееў лічыць, што гэты храм быў царквою Барыса і Глеба, пабудаванай Барысам Усяславічам у першых дзесяцігоддзях XII стагоддзя ў якасці радавой пахавальні, дзе ён і быў пахаваны пасля сваёй смерці ў 1128 годзе [9, с. 105].

На месцы, дзе размяшчалася Царква-на-рове, М.К. Каргер у 1967 годзе знайшоў два цагляныя саркафагі. На некаторых плінфах выяўлены знакі трохзубцаў. Храм датуецца трэцяй чвэрцю XII стагоддзя [26, с. 156].

Пахавальныя комплексы ў межах культавых будынкаў маюць яскрава акрэсленую сацыяльную дыферынтацыю. Калі раней курганны насып з’яўляўся адзінай канструкцыяй пахавальнага збудавання як для заможнага чалавека, так і для простага, то пахаванні, зробленыя ўнутры храмаў у саркафагах і аркасоліях, прызначаны ў першую чаргу для князёў, іх сем’яў і вышэйшага кліру, а затым для заможных

PolotskSU



пасаднікаў і святароў. Людзей з меншым сацыяльным статусам маглі хаваць на могілках вакол храмаў у драўляных трунах ці нават без іх.

Кансерватызм у некралагічных традыцыях дазваляе рэканструяваць асобныя элементы пахавальнага абраду, абапіраючыся на сучасныя кананічныя рытуалы праваслаўных пахаванняў і не ўлічваючы вярбальны кампанент – службы, малітвы і інш. Сучасны чын пахавання ў праваслаўнай царкве захаваў галоўныя рысы таго абраду, што першапачаткова існаваў у хрысціян. Паводле некралагічных канонаў [22, с. 24 – 25; 24, с. 10 – 13] пасля смерці цела нябожчыка патрэбна абмыць і апрануць дзеля таго, каб ён у чысціні прадстаў перад Богам у час уваскрашэння. Цывільных звычайна павінны абмываць вадой старыя людзі. Святароў не абмываюць, а цела іх абціраюць алеем. Рабіць гэта маюць права толькі клерыкальныя асобы. Адзенне трэба выбіраць згодна са службовым палажэннем, таму што кожны будзе павінен падчас страшнага суда даць адказ за ўсе свае ўчынкі, у тым ліку і службовыя.

Рукі памерламу перакрыжоўваюць на грудзях, прычым правая рука павінна быць зверху, левая пад ёй. На лоб кладуць венчык, на грудзі – крыжык. Труну кропяць святой вадой і акурваюць ладанам.

Хаваюць нябожчыка звычайна на трэці дзень, таму што душа ў гэты час вяртаецца з мытарстваў. Памерлы ў магіле абавязкова павінен ляжаць галавой на захад, каб твар яго глядзеў на ўсход. Памінаць трэба на трэці, дзевяты, саракавы дні і праз год пасля смерці.

Згодна з біблейскім вучэннем аб вяртанні цела ў зямлю (Быц. 3:19; Екл. 12:7), хрысціянская царква ва ўсе часы хавае сваіх нябожчыкаў у зямлі альбо ў пахавальні.

Княскія пахавальныя комплексы ў межах культавых збудаванняў шырока вядомы на ўсей тэрыторыі ўсходніх славян. Адзін з першых мураваных храмаў у Кіеве, Дзесяцінная царква, ужо з першых часоў свайго існавання выступае як княская пахавальня [15, с. 103]. У Наўгародскай Сафіі быў знойдзены саркафаг, практычна сінхронны стварэнню храма, які звязваецца з пахаваннем князя Уладзіміра Яраслававіча, ініцыятара будаўніцтва Сафіі [32, с. 124].

У Полацку ў якасці княскіх пахавален маглі выступаць Пятніцкая царква Барысаглебскага манастыра, царква на Ніжнім замку, прыбудовы да Сафіі і магчыма крыпта ў храме-пахавальні Ефрасіннеўскага манастыра.

На жаль, ніводнага некранутага пахавання, якое магло б быць ідэнтыфікавана як княскае, у Полацку не знойдзена. Але некралагічныя комплексы ў іншых гарадах даюць магчымасць абазначыць агульныя рысы пахавальнага абраду валадароў. Князёў і членаў іх сем'яў пасля смерці апраналі ў дарагое каштоўнае адзенне, якое яны насілі пры жыцці. У вызначаных княскіх пахаваннях знаходзілі фрагменты парчовага і шаўковага адзення, упрыгожанняў з каштоўнага металу [13, с. 206 – 207; 14, с. 106 – 107]. У якасці сімвала княскай улады ў некаторых пахаваннях побач з рэшткамі знаходзяць меч [14, с. 101]. Наяўнасць мяча супярэчыць кананічнай абраднасці і звязана з язычніцкімі некралагічнымі рытуаламі.

У часы язычніцтва ва ўсходніх славян, паводле іх уяўленняў аб смерці, заможны, багаты чалавек і на тым свеце заставаўся знатным і багатым. Ён карыстаўся тымі ж рэчамі, што і пры жыцці. Прычым лічыцца, што сваім становішчам на тым свеце ён абавязаны толькі сабе, таму што бог акрамя месца іншага жыцця нічога больш не даваў нябожчыку [25, с. 51].

Зусім інакш трактавалася сацыяльная няроўнасць хрысціянскімі некралагічнымі ўяўленнямі. Знатныя і багатыя валадары будуць пакутаваць на тым свеце. Адзіны шанец выратавацца – пазбавіцца свайго багацця, улады і пакаяцца за свае грахі. Ёсць сведчанні аб тым, што некаторыя князі пастрыгаліся перад смерцю ў манахі і давалі абет беднасці. Таму ў княскіх пахаваннях часам знаходзяць манаскую атрыбутыку [23, с. 4].

У Лаўрэнцьеўскім летапісе ёсць апісанне пахавання Уладзіміра Святаслававіча, у якім гаворыцца аб некаторых дэталях абраду: «Ночью же межю двема клетми пролмавше помост, обербевше в ковёр и уши свесшиа на землю; взложыше и на сани, везше поставиша и в святит Богородицы, юже бе създал сам. Се же уведевше людье, бес числа снидосшася и плакашася по немь, боляре аки заступника их земли, убоги аки заступника и кормителя; и вложиша и в корьсту мраморяну, схорониша тело его с плачем» (Лавр. лет. 6523(1015)). Абгорнутае ў саван (?) цела Уладзіміра вязуць на санях у царкву, дзе яго хаваюць у мармуровым саркафагу. Сані выкарыстоўваліся для транспартыроўкі заможных нябожчыкаў з язычніцкіх часоў. Каштоўны мармуровы саркафаг, аздоблены разьбою, як сведчыць Тытмар Мерзебургскі, быў пастаўлены ў цэнтры храма. Побач потым паставілі саркафаг жонкі Уладзіміра, Ганны [15, с. 104].

Але больш звычайнымі для княскіх пахавален з'яўляліся саркафагі, зробленыя з чырвонага шыферу альбо з вапняку. Абломкі падобнага саркафага знойдзены ў царкве на Ніжнім замку. Саркафагі гэтага тыпу ў XI – XIII стагоддзях мелі звычайна прамавугольную форму і складаліся з шасці ці сямі шыферных пліт, у залежнасці ад формы века. З шасці пліт рабіліся саркафагі з плоскім векам, з сямі пліт – з двухсхільным. Такія саркафагі былі знойдзены ў многіх гарадах старажытнай Русі, у тым ліку і ў Тураўскім храме [13, с. 200, 206 – 207; 14, с. 106 – 107; 18, с. 225]. Шыферныя пліты замацоўваліся з дапамогаю жалезных прутоў з унутранага боку, альбо жалезнымі абручамі – з вонкавага. Века замазва-

PolotskSU



лася вапнай. Вонкавая паверхня магла аздабляцца разьбой, незалежна ад таго, стаяў саркафаг адкрыта на падлозе храма ці размяшчаўся пад падлогай. Магчыма падобныя саркафагі былі ў крыптах Пятніцкай царквы і храма-пахавальні.

У летапісах ёсць сведчанні аб тым, што ва ўсходнеславянскіх землях рэшткі князёў, якія памерлі язычнікамі, выкопваліся, затым над імі адбываўся абрад хрышчэння, а пасля косткі зноў перазахоўваліся ў храме. Так, у 1044 годзе па загаду Яраслава Мудрага былі выкапаны косткі князёў Яраполка і Алега Святаслававічаў, якія пасля хрышчэння былі пакладзены ў Дзесяцінную царкву ў Кіеве: «В лето 6552 г. выгребоша князя Ярополка и Олега, сына Святослава и крестиша кости ею, и положиша я в церкви святыя Богородицы» [15, с. 104]. Ці адбываўся такі рытуал у Полацкай зямлі невядома.

Іншым тыпам пахавальнага збудавання ў культавых будынках з'яўляюцца саркафагі, складзеныя з плінфы. Падобныя саркафагі былі распаўсюджаны ў шматлікіх храмах старажытных гарадоў, асабліва ў Полацку і Смаленску.

Цагляны саркафаг уяўляе сабой стацыянарную прамавугольную канструкцыю, складзеную з плінфы на цамяначнай рошчыне. Яны знойдзены ў прыбудовах да Полацкай Сафіі, храме-пахавальні і Царкве-на-рове.

Больш простыя, чым мармуровыя і шыферныя, цагляныя саркафагі маглі прызначацца для пахавання асоб княскага роду (Сафія) і кліра (храм-пахавальня). Усе выяўленыя саркафагі ў храмах Полацка размяшчаліся пад падлогай. Аднак у суседняй, Смаленскай, зямлі вядомы тынкаваныя цагляныя саркафагі, пастаўленыя на падлогу ўздоўж сцен храма [10, с. 48]. Таму магчыма, што знойдзеныя П.А. Рапапортам кавалкі абмазкі ў Ніжняй царкве, паходзяць ад прысценных саркафагаў. Роспіс на сценах і веках цагляных саркафагаў мог імітаваць разьбу каменных альбо, як у храмах Смаленска, драпіроўку з тканіны [10, с. 134].

Цагляныя саркафагі пад падлогаю храмаў размяшчаліся радамі, арыентаванымі па лініі поўнач – поўдзень. Зверху яны замуроўваліся і перакрываліся пліткамі падлогі. Напэўна, месца пахавання абазначалася асобным колерам, альбо арнаментам, мяркуючы па колькасці і разнастайнасці плітак падлогі ў храме-пахавальні. Такія саркафагі маглі дабудоўвацца па меры патрэбы – майстрам неабходна было ўскрыць падлогу храма, дабудаваць да існуючага саркафага заходнюю, усходнюю і мерыдыяльную сценкі, а пасля пахавання замазаць века і пакласці плітку падлогі.

Апошнім тыпам пахавальнага збудавання, знойдзеным у Полацку, з'яўляюцца аркасоліі. Аркасолій уяўляў сабой прамавугольнае паглыбленне ў сцяне храма з арачным завяршэннем. Вылучаюць тры віды аркасоліяў [23, с. 8]: 1) адкрытыя нішы, у якіх змяшчаліся драўляныя альбо каменныя саркафагі; 2) паўзакрытыя нішы. Такі аркасолій меў пярэднюю сценку з цэглы, якая стварала аб'ём, куды клалі нябожчыка, затым аб'ём замуроўваўся. Звычайна адкрытую заднюю сцяну аздаблялі роспісам; 3) зачыненыя аркасоліі, якія пасля пахавання цалкам закладваліся цэглай. Атрымаўшуюся сцяну маглі таксама аздабляць роспісам.

Аркасоліі толькі другога віда знойдзены ў Полацку, у храме-пахавальні. Аднак гэта не выключае існавання ў полацкіх храмах і іншых відаў аркасоліяў.

Усе некранутыя пахаванні, выяўленыя ў храме-пахавальні, інтэрпрэтуюцца як магілы кліра – епіскапаў, а пазней, магчыма, і манахаў.

Пахаванні кліра ў тыя часы адрозніваліся беднасцю. Але ў некаторых гарадах сустракаліся пахаванні іерархаў царквы з фрагментамі багатага культавага адзення і царкоўных рэчаў [23, с. 12]. Паводле старажытнага канона праваслаўнай царквы, памерламу святару на грудзі клалі евангелле, а ў рукі – крыж. Малюнак-графіці канца XI – XII стагоддя – нябожчык са святой кнігай і крыжом пад перакрыжаванымі на грудзях рукамі – выяўлены на сцяне Наўгародскай Сафіі [20, с. 224]. Аднак, улічваючы вялікую каштоўнасць кніг у той час і адсутнасць археалагічных доказаў, можна меркаваць, што кнігі маглі выкарыстоўвацца толькі падчас адпявання і не клаліся ў магілу.

Усе саркафагі з рэшткамі ў храме-пахавальні безінвентарныя, нават няма слядоў адзення. Верагодна, што яны належаць манаству. Тым больш у некаторых пахаваннях сустракаюцца каменныя падушкі – кавалкі плінфы падкладзеныя пад галаву замест звычайнай падушкі, што сведчыць аб падкрэсленым аскетызме памерлых [19, с. 113].

Палажэнне рук пахаваных супярэчыць сучаснаму канону: рукі перакрыжаваны на жываце, прычым левая рука ляжыць над правай.

Выпадкі, калі адна рука ляжыць на грудзях, а другая на жываце, альбо рукі выцягнуты ўздоўж тулава, шырока вядомы па курганным пахаванням. Такое палажэнне рук з'яўляецца рудыментам язычніцтва. Некананічнае палажэнне рук памерлых сустракаецца таксама і ў Смаленскіх храмах [10, с. 82]. Некаторыя нябожчыкі былі, магчыма, абгорнуты тканінай – саванам, аб чым сведчаць вельмі блізка ссунутыя косткі ног шкілетаў.

PolotskSU



Парныя пахаванні ў адным саркафагу могуць быць прыкладам падзахавання ў старую магілу, а бессістэмна раскіданыя косткі ў падобных пахаваннях – прыклад перазахоўвання рэшткаў даўно памерлых людзей.

Яшчэ адным тыпам некралагічных комплексаў у культавых збудаваннях з'яўляюцца пахаванні мошчаў святых у раках – спецыяльных саркафагах, зробленых з каштоўных матэрыялаў, якія размяшчаліся ў асобных памяшканнях. У полацкіх храмах такія комплексы не выяўлены. Аднак мошчы святой Ефрасінні Полацкай ўсходнеславянскія манахі везлі ў 1187 годзе з Ерусаліма ў срэбранай раке, якая потым была пастаўлена ў дальніх пячорах Кіеўскага Пячорскага манастыра [4, с. 72]. Нягледзячы на свой манаскі чын, Ефрасіння была апранута не ў простую манаскую рызу. У 1922 годзе адбылося ўскрыццё ракі з мошчамі святой. Пад пазнейшым аддзеннем былі выяўлены «костяк, завёрнутый в шёлковые лоскуты… Часть рёбер провалилась вовнутрь и подпёрта каким-то материалом, по развёртыванию оказавшимся частями парчового облачения» [4, с. 78 – 79].

Важным сведчаннем выконвання кананічнага рытуалу з'яўляюцца памінальныя надпісы-графіці на сценах усходнеславянскіх храмаў, так як на саміх плітах саркафагаў надпісы пачалі рабіць толькі з канца XV стагоддзя [32, с. 72].

Звычайна ў памінальным надпісе выкарыстоўвалася слова «преставіса» і абавязкова адзначаўся месяц і дзень смерці, а год маглі не пісаць.

У Полацку памінальныя надпісы выяўлены толькі ў Спаскай царкве Ефрасіннеўскага манастыра [27, с. 121 – 122]: «м/еся/ца авоуста в 3 день преставіся козумнаА письца иконьного»; «м/еся/ца аугуста раба божиа Соломонида». Вельмі важна было памятаць дакладную дату смерці для памінання кожны год.

**Высновы.** Пранікненне ў Полацкія землі хрысціянскіх пахавальных традыцый звязана непасрэдна з будаўніцтвам у Полацку спачатку драўляных, а затым і мураваных храмаў. Вакол іх, як і ў суседніх княствах, пачынаюць фарміравацца могілкі, нявыключаны пахаванні і ўнутры будынкаў. Гэты працэс супадае з асноўнай тэндэнцыяй фарміравання хрысціянскіх гарадскіх некропаляў ва ўсходнеславянскіх землях. Менавіта гарадскія жыхары першымі ўспрынялі і пачалі ўжываць новы абрад, у той час як сялянскі асяродак супраціўляўся навацыям яшчэ доўгі час.

Да XII стагоддзя ўсталяваўся кананічны пахавальны абрад, згодна з якім заможных нябожчыкаў і вышэйшы клір хавалі ўнутры культавых збудаванняў, больш простых – на звычайных могілках. Ён уключаў абмыванне цела памерлага, апрананне яго ў адзенне адпаведна сацыяльнаму статусу нябожчыка, транспартыроўку яго ў храм для адпявання і затым пахаванне непасрэдна ў храме альбо побач з яго сценамі, так як адна з галоўных умоў хрысціянскага пахавальнага абраду – стварэнне могілак на асвечанай царквою зямлі [23, с. 4]. Некаторыя адхіленні ад кананічных некралагічных традыцый з'яўляюцца вынікам сенкрытызму язычніцкіх уяўленняў і пашыраючайся хрысціянскай ідыялогіі, што назіраецца ў парушэнні асобных дэталяў рытуалу пахавальнага абраду.

Найбольш пашыранай формай пахавальнага аб'ёму XII – XIII стагоддзяў у мураваных храмах Полацка з'яўляюцца цагляныя саркафагі, якія размяшчаліся пад падлогай храма. Вонкавая паверхня мураваных саркафагаў тынкавалася і аздаблялася роспісам. Паўзакрытыя аркасольныя нішы аздабляліся мазаікай са смальты. Акрамя цагляных саркафагаў выкарыстоўваліся аб'ёмы, зробленыя з шыферных пліт. Але галоўнай адметнасцю пахавальных комплексаў XII – XIII стагоддзяў у мураваных культавых будынках з'яўляецца наяўнасць падземных крыпт. У храмах старажытнай Русі зафіксаваны толькі дзве крыпты, ў Полацку.

ЛІТАРАТУРА


1. Алексеев, Л.В. Древний Мстиславль в свете археологии / Л.В. Алексеев // Гіст.-археалаг. зб. – 1995. – С. 118 – 182.
2. Алексеев, Л.В. Домонгольская архитектура Полоцкой земли в историческом осмыслении / Л.В. Алексеев // Российская археология. – 1996. – № 2. – С. 96 – 110.
3. Алексеев, Л.В. Полоцкая земля (Очерки истории северной Белоруссии в IX – XIII вв.) / Л.В. Алексеев. – М.: Наука, 1966. – 295 с.
4. Арлоў, У. Ефрасіння Полацкая / У. Арлоў. – Мінск: Маст. літ., 1992. – 220 с.
5. Арьес, Ф. Человек перед лицом смерти / Ф. Арьес. – М.: Прогресс. Прогресс-академия, 1992. – 527 с.
6. Булкин, Вал.А. Исследование Софийского собора в Полоцке / Вал.А. Булкин // Археологические открытия 1980. – М.: Наука, 1981. – С. 331.
7. Булкин, Вал.А. Проблемы изучения Полоцкого Софийского собора / Вал.А. Булкин // Древнерусское государство и славяне. – Минск: Наука и техника, 1983. – С. 113 – 114.
8. Булкин, Вал.А. Исследование древнерусского зодчества по итогам работы архитектурно-археологической экспедиции кафедры истории искусств СПбГУ в 1970 – 1990 гг. / Вал.А. Булкин // Искусство XX в. – СПб., 1996. – С. 261 – 277.

PolotskSU



9. Воронин, Н.Н. К истокам Полоцкого зодчества XII в. / Н.Н. Воронин // Краткие сообщ. Ин-та археологии АН СССР. – 1965. – № 100. – С. 102 – 104.
10. Воронин, Н.Н. Зодчество Смоленска XII – XIII вв. / Н.Н. Воронин, П.А. Раппопорт. – Л.: Наука (Ленингр. отдел.), 1979. – 414 с.
11. Высоцкий, С.А. Запись о саркофаге Всеволода Ярославовича / С.А. Высоцкий // Советская археология. – 1963. – № 4. – С. 228 – 232.
12. Заяц, Ю.А. Заславль в эпоху феодализма / Ю.А. Заяц. – Минск: Наука и техника, 1995. – 190 с.
13. Каргер, М.К. Раскопки и реставрационные работы в Георгиевском соборе Юрьева монастыря в Новгороде / М.К. Каргер // Советская археология. – 1946. – В. VIII. – С. 175 – 224.
14. Каргер, М.К. Археологические исследования древнего Киева. Отчёты и материалы Киевской археологической экспедиции (1938 – 1947 гг.) / М.К. Каргер. – Киев: Акад. наук Украинской ССР, 1951. – 252 с.
15. Каргер, М.К. Древний Киев. Очерки по истории материальной культуры древнерусского города / М.К. Каргер. – М.; Л.: Акад. наук СССР (Ленингр. отдел.), 1961. – Т. II: Памятники Киевского зодчества X – XIII вв. – 661 с.
16. Каргер, М.К. Храм-усыпальница в Ефросиньевском монастыре в Полоцке / М.К. Каргер // Советская археология. – 1977. – № 1. – С. 240 – 247.
17. Кніга жыцій і хаджэнняў / уклад. А. Мельнікаў; навук. рэд. В. Чалярыцкі. – Мінск: Мастацк. літ., 1994. – 503 с.
18. Лысенко, П.Ф. Туровская земля IX – XIII вв. / П.Ф. Лысенко. – Минск: Белорус. наука, 2001. – 267 с.
19. Макаров, Н.А. Каменные подушки в погребениях древнерусских городских некрополей / Н.А. Макаров // Советская археология. – 1981. – № 2. – С. 111 – 116.
20. Никитина, Ю.И. Рисунки-граффити из Софии Новгородской / Ю.И. Никитина // Советская археология. – 1990. – № 3. – С. 220 – 232.
21. Номоканон // Христианство: энцикл. слов.: в 3-х т. / редкол.: С.С. Аверинцев (гл. ред.) [и др.]. – М.: Большая Рос. энцикл., 1995. – Т. II. – С. 356 – 357.
22. Обряды Русской Православной Церкви. Погребение. – Смоленск: Смоленская епархия: Смядынь, 1994. – 68 с.
23. Панова, Т.Д. Городской погребальный обряд средневековой Руси (XI – XVI вв.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 053.05.29. / Т.Д. Панова; Моск. гос. ун-т им. М.В. Ломоносова. – М., 1990. – 17 с.
24. Православный обряд погребения. – М.: Свято-Данилов мужской монастырь: Благовест, 1994. – 67 с.
25. Рапов, О.М. Русская церковь в IX – первой трети XII в. Принятие христианства / О.М. Рапов. – М.: Высш. шк., 1988. – 414 с.
26. Раппопорт, П.А. Полоцкое зодчество XII в. / П.А. Раппопорт // Советская археология. – 1980. – № 3. – С. 142 – 161.
27. Тарасаў, С.В. З гісторыі Полацкай эпіграфікі X – XV стст. / С.В. Тарасаў // Кніжная культура Беларусі. Да 500-годдзя з дня нарадж. Ф. Скарыны: зб. навук. прац / рэдкал.: М.П. Стрыжонак (адказны рэд.) [і інш.]. – Мінск: АН БССР. Цэнтр. навук. б-ка імя Я. Коласа, 1991. – С. 114 – 129.
28. Тарасаў, С.В. Узнікненне дзяржавы і царквы на Беларусі ў X – XIII стст. / С.В. Тарасаў // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэсп. Беларусь. Новыя падыходы: у 2-х ч. / БДУ, Ін-т гісторыі АН Беларусі. Усебеларуская канф. гісторыкаў, Мінск, 3 – 5 лют. 1993 г.; рэдкал.: М.П. Касцюк (адказны рэд.) [і інш.]. – Мінск: Універсітэцкае, 1994. – Ч. I: Гісторыя Беларусі. – С. 36 – 37.
29. Тарасаў, С.В. Полацк IX – XVIII стст.: Гісторыя і тапаграфія / С.В. Тарасаў. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – 183 с.
30. Хозеров, И.М. Белорусское и Смоленское зодчество XI – XIII вв. / И.М. Хозеров. – Минск: Наука и техника, 1995. – С. 193.
31. Хрущёва, Л.Г. Крещальни древнерусских храмов / Л.Г. Хрущёва // Проблемы изучения древнерусского зодчества (по материалам архитектурно-археологических чтений, посв. памяти П.А. Раппопорта, 15 – 19 янв. 1990 г. – СПб.: Дмитрий Буланин. Наука, 1996. – С. 34 – 35.
32. Янин, В.Л. Некрополь Новгородского Софийского собора / В.Л. Янин. – М.: Наука, 1988. – 240 с.
33. Булкнн Вал.А. Отчёт об археологических исследованиях Софийского собора и прилегающих к нему территорий в 1978 г. / Вал.А. Булкин. – Минск, 1979 // Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Д. 594.
34. Каргер, М.К. Альбом к отчёту об археологических раскопках 1962 г. в Полоцке и Новогрудке / М.К. Каргер. – Л., 1963 // Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Д. 166а.

*Паступіў 20.05.2008*